# СТАВІМ ОПЕРУ

## Праграма пастаноўкі дзіцячай оперы “Вавёрчына гора” па аднайменнай казцы В. Віткі

Уласцівыя малодшым школьнікам прыродная актыўнасць, вера ў свае сілы, багатая фантазія, неверагодная вынаходлівасць і лёгкае ўспрыняцце мастацкіх вобразаў — цудоўны падмурак для іх творчага развіцця.

Развіццё творчага патэнцыялу дзяцей гэтага ўзросту праводзіцца з дапамогай разнастайных відаў мастацтва, сярод якіх асаблівае месца належыць музычнай дзейнасці: слуханню музыкі, харавому спяванню, выкананню музычна-рытмічных рухаў і сачыненню мелодый да апавядальных і вершаваных тэкстаў.

Тэатральны гурток — гэта форма заняткаў, якая ўяўляе пазнаваўча-пошукавую мастацкую дзейнасць, што садзейнічае ўзбагачэнню жыццёвых і мастацкіх уяўленняў, вопыту і творчых магчымасцей школьнікаў.

У працэсе работы гуртка вырашаюцца наступныя задачы:

развіццё ў дзяцей цікавасці да тэатральна-гульнявой дзейнасці і жадання ўдзельнічаць у імправізацыях і інсцэніроўках;

стымуляванне ў малодшых школьнікаў жадання прыдумваць казкі, апавяданні, новыя вобразы;

навучанне свабоднаму карыстанню ў інсцэніроўках маналагічнай і дыялагічнай формамі мовы;

развіццё ўяўленняў дзяцей аб розных відах мастацтва, іх узаемадзеянні і асаблівасцях;

развіццё эмпатыі, здольнасці разумець эмацыянальны стан героя і ўмення адэкватна перадаваць свой настрой.

Вырашэнне гэтых задач патрабуе ад кіраўніка гуртка аптымальнага выбару метадаў і прыёмаў працы ў залежнасці ад музычнага вопыту дзяцей. Дзейнасць школьнікаў у час заняткаў павінна быць разнастайнай, з абавязковым правядзеннем гульняў, умовы якіх павінны ўдакладняцца на кожным новым этапе працы з творам. Спачатку гульні можа весці педагог, потым — самі дзеці. Пытанні ва ўступных гутарках можна задаваць “спяваючы”, прапаноўваючы вучням “спяваць” адказы. Гэта з’явіцца добрай падрыхтоўкай да самастойнага сачынення мелодый на вершаваныя тэксты.

На першых занятках гуртка педагогу даводзіцца назіраць, што дзеці не выказваюць цікавасці да дзейнасці, якую ён ім прапануе. Замест таго каб самастойна разважаць і праяўляць уласцівую іх узросту фантазію, яны аддаюць перавагу пасіўнаму назіранню. Вось чаму галоўнае для кіраўніка гуртка — не прапусціць момант, калі ў кагосьці з дзяцей узнікне жаданне выказаць самастойную думку, падтрымаць і пахваліць яе аўтара. І тады, як правіла, у астатніх вучняў знікае няўпэўненасць, разам з жаданнем атрымаць пахвалу з’яўляецца жаданне прыняць удзел у разважаннях і абмеркаваннях пэўнай ідэі. Паступова ў калектыве ствараецца атмасфера поўнага даверу, што з’яўляецца абавязковай умовай развіцця творчай актыўнасці школьнікаў.

Безумоўна, шлях ад няўпэўненасці і пасіўнасці дзяцей да актыўнага ўдзелу ў творчай дзейнасці будзе не такім імгненным, як бы хацелася. Але педагог можа зрабіць яго больш кароткім, цікавым, насычаным, мэтанакіраваным і рацыянальным. Пры гэтым ні ў якім выпадку нельга паскараць працэс ці падштурхоўваць школьніка да пэўных вынікаў. Гэта толькі запаволіць творчае развіццё вучня.

Арганізуючы працу з малодшымі школьнікамі, трэба памятаць, што іх творчае развіццё магчыма толькі пры наяўнасці станоўчай матывацыі. Пачынаць любую дзейнасць трэба з пастаноўкі мэт і задач, падрыхтоўкі дзяцей да актыўнага ўспрыняцця гэтай дзейнасці. Забеспячэнню добразычлівай эмацыянальнай атмасферы на занятках садзейнічае стварэнне клімату псіхалагічнай бяспекі, захапленне гуртkоўцаў новымі ідэямі, нават калі яны часткова памылковыя. Педагог можа тактоўна выправіць памылку або ўзяць яе за аснову новай незвычайнай ідэі.

Галоўнымі псіхалагічнымі арыенцірамі, якія дазваляюць рэалізаваць на практыцы эмацыянальна-мастацкую драматургію, з’яўляюцца супрацоўніцтва і сатворчасць удзельнікаў гуртка. Ход заняткаў павінен быць добра прадуманы, каб у дзяцей узнікла неабходная эмацыянальная захопленасць мастацка-творчай дзейнасцю.

Правільная арганізацыя ўзаемаадносін паміж вучнямі — адна з неабходных умоў паспяховасці працы гуртка. Побач з франтальнымі і індывідуальнымі вялікі эфект дае правядзенне групавой формы работы, якая актывізуе дзяцей і садзейнічае развіццю ў іх пачуцця адказнасці і супрацоўніцтва. Пры выбары форм работы трэба не супрацьпастаўляць іх адна адной, а імкнуцца да адзінства. Індывідуальная і групавая формы работы павінны падвесці школьніка да паступовага асэнсавання мэт сваёй дзейнасці, спосабаў уздзеяння на партнёра і гледачоў, шляхоў пераадолення цяжкасцей, якія ўзнікаюць пры стварэнні пэўнага вобраза.

Для таго каб дзеці свабодна паводзілі сябе на сцэне, мэтазгодна час ад часу даваць гуртkоўцам магчымасць выступаць перад пэўнай аўдыторыяй, каб публічныя выступленні сталі для іх звычайнымі. Да аналізу выступленняў трэба падыходзіць вельмі асцярожна, каб пазбегнуць узнікнення ў “артыстаў” абвостранага пачуцця “ўнутранага крытыка”. Гэта дазволіць зберагчы дзіцячую непасрэднасць, эмацыянальную свабоду і камфорт, не прывязваць да “спаду” ў творчасці, калі малодшы школьнік убачыць разрыў паміж задуманым вобразам і яго ўвасабленнем. Пры ацэнцы выкананага задання неабходна ўлічваць ступень разумення вучнем вобраза, які ён стварае.

Пры пастаноўцы оперы кіраўніку гуртка трэба памятаць, што актыўнасць у галіне музычнай творчасці ў малодшых школьнікаў цесна звязана з актыўнасцю ў паэтычнай творчасці, бо музычны вобраз пазбаўлены бачнасці і дакладнасці ў адрозненне ад жывапісу і літаратуры. Таму больш цэласнаму разуменню будзе садзейнічаць сінтэз некалькіх відаў мастацтва.

Творчым характарам на занятках павінна адрозніваецца не толькі практычная дзейнасць, але і гутаркі. Добра, калі ўдала прадуманы педагогам іх змест і форма (напрыклад, “спевы” пытанняў і адказаў) запаляць у душы дзіцяці жаданне стаць іх актыўным удзельнікам. Гутаркі, як і творчыя заданні, павінны мець пэўную паслядоўнасць, развіваць уменне “бачыць” аб’ект, які ствараецца. Калі вучні атрымліваюць пытанне, адказ на якое патрабуе праяўлення творчасці і фантазіі, педагогу трэба выслухаць як мага болей адказаў, арыентуючы дзяцей на бачанне мэтазгоднасці ў кожным творчым рашэнні.

Дамашнія заданні, якія прапануе праграма, — гэта, перш за ўсё, сродак выпрацоўкі навыкаў самастойнай творчай працы. Таму і выконваюцца яны па жаданню.

Праграма падрыхтоўкі да пастаноўкі оперы разлічана на 32 гадзіны і можа быць рэкамендавана для навучальных устаноў новага тыпу эстэтычнай накіраванасці. У залежнасці ад магчымасцей гуртка праграмны матэрыял і прыведзеныя гадзіны могуць вар’іравацца. Прыкладнае размеркаванне матэрыялу па гадзінах можа быць такім:

1. Знаёмства з казкай (1 г).
2. Адкуль узнікаюць казкі (1 г).
3. Сачыненне і развучванне мелодый на вершаваныя тэксты з казкі В. Віткі “Вавёрчына гора” (3 г).
4. Падрыхтоўка дэкарацый (1 г).
5. Падрыхтоўка касцюмаў (1 г).
6. Імправізацыя музычна-рытмічных рухаў імітацыйнага характару (1 г).
7. Пастаноўка часткі оперы (1 г).
8. Пастаноўка оперы (2 г).

**Дзеючыя асобы**

| | |
|---|---|
| Аўтар. | Звяры. |
| Вавёрка. | Крот. |
| Дочкі. | Зайцы. |
| Унучкі. | Сініцы. |
| Сын. | Гусі. |
| Дзяцел. | Хор. |
| Бусел. | |

**ДЗЕЯ ПЕРШАЯ**

(*Паляна, на ёй шмат кветак, расце некалькі дрэў. Самае вялікае — у цэнтры. У ім — дупло-хатка Вавёркі. Яна, сумная, стаіць побач. З абодвух бакоў каля яе звяры. Яны спяваюць.*)

**Звяры.**

Раскажам вам мы
Пра Веру-вавёрачку
І пра яе горачка,
Пра яе маленькіх дочак,
Пра вавёрчын малаточак,
Пра птушынага пасла —
Даўганосага бусла,
Пра жыццё-быццё лясное
І яшчэ пра тое-сёе.

(*Звяры, акрамя Вавёркі, Дочак і Унучак, пакідаюць сцэну.*)

**Аўтар**.

Забалелі у вавёркі зубкі,
І не можа раскусіць шкарлупкі.
Плача наша бедная вавёрачка:

**Вавёрка**.

Гора маё, горачка...

**Аўтар**.

Сабралася ўся яе радня.
Думаюць, гадаюць ноч да дня:

**Дочкі і Унучкі**.

Як тут быць? І што рабіць?
Што рабіць? І як нам быць?

**Аўтар**.
Прыкладаюць сумненькія дочкі
Мамачцы любіменькай прымочкі.
Грэюць дзве гарэзлівыя ўнучкі
Дарагой бабулечцы анучкі.
Але яшчэ болей баляць зубкі,
І не можа раскусіць шкарлупкі.
Так. Не можа раскусіць шкарлупкі,
Бо баляць вавёрачкіны зубкі.
**Хор**.
Вестку тут паслалі яе сыну.
Ён адразу справы ўсе пакінуў
І праведаць мамачку прыехаў,
Ды прывёз паўнюткі мех арэхаў,
Бо не ведаў, што баляць ёй зубкі,
Што не можа раскусіць шкарлупкі.
Так. Не можа раскусіць шкарлупкі,
Бо баляць вавёрачкіны зубкі.
(*Уваходзіць Сын.*)
**Вавёрка**.
Лепей прывёз бы ты мне малаточак,
Мой дарагі і любімы сыночак,
Каб болей зубачкі я не трудзіла,
Я б малатком ўсе шкарлупкі разбіла.
**Сын**.
Што ж, матуля, у маёй старане
Ёсць каваль. Пры гэтым ён мой друг.
Што захочаш зробіць для мяне
І табе ён зробіць нават плуг.
**Вавёрка**.
Плуг не патрэбны мне, мой сыночак,
Хай лепей зробіць ён мне малаточак.
**Сын**.
Я дам тэлеграму — зробіць ураз, —
**Аўтар**.
Сын гаворыць маці ў адказ.
І сарваў дубовы лісток
Тут вавёрачкін сынок.
**Сын** (*піша*).
Мой любімы дружок,
Я прашу: зрабі малаток,
Бо баляць у мамачкі зубкі,
І не можа раскусіць шкарлупкі.
Так. Не можа раскусіць шкарлупкі,
Бо баляць вавёрачкіны зубкі.
**Хор**.
Сказалі сёстры брату:
**Дочкі**.
Навошта
Табе хадзіць самому на пошту?
Мы ведаем, дзе стары граб.
Мы збегаем на тэлеграф.
**Вавёрка**.
Нясіце, каб сёння ж дайшла тэлеграма.
Не будзе балець раток у мамы.
Няхай сам начальнік на бланку
Паставіць пячатку "Маланка".

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

(*Лес. Па сцежцы, высланай лісцем, бягуць сёстры. Робяць некалькі кругоў, дабягаюць да дрэва з надпісам "Тэлеграф".*)

**Аўтар**.
Імчацца шустрыя сёстры,
Мільгаюць дрэвы і вёрсты.
Лістамі сцежку ім сцеле граб.
Імчалі сёстры, ляцелі.
Прыбеглі так, як хацелі.
Прыбеглі сёстры на тэлеграф.
Вавёркі лапкай — стук-стук!
У дупло да дзятла: стук-стук!
Ён у адказ ім:
**Дзяцел**.
Хто тут? Хто тут?
Не замінайце мне спаць
І не стучыце ў дупло.
Ужо і сонца даўно зайшло.
**Дочкі**.
Памажыце, дзядзюхна дзяцел!
Плача наша хворая маці.
Тэлеграму трэба адбіць.
Што ж зараз нам рабіць?
**Аўтар**.
Тут падабрэў наш начальнік,
Наш непрыступны маўчальнік,
І акуляры свае надзеў.
**Дзяцел**.
Тады пашлю заўтра ўранку,
Бо не магу я з маланкай.
**Аўтар**.
І на вавёрачак паглядзеў.
**Дочкі**.
Будзе позна заўтра ўранку,
Бо нам загадала мама,
Каб паслалі вы з маланкай
Нашу тэлеграму.
**Дзяцел**.
Не робіць бесперастанку
У мяне на пошце маланка.
Хто ж перадасць тэлеграму? Хто ж?
Вы не сумуйце адразу.
Мы ўсё прыдумаем зараз.
Перанясе яе хутка дождж.
(*Сёстры бягуць у адваротным накірунку. Прыбягаюць да дрэва з надпісам "Вавёрчына хатка" і хаваюцца за гэтым дрэвам.*)
**Аўтар**.
Бягуць вавёркі і чуюць,
Што ціха кроплі друкуюць
Іх тэлеграму:
— Тук-ток, тук-ток.
Баляць у мамачкі зубкі,
І не крануць ёй шкарлупкі.
Прыйшлі, мой дружа, ёй малаток.
**Хор**.
Паплыў лісток у тую даль,
Дзе пражывае каваль.
І тэлеграма прыйшла ў час.
Заказ даўно ўжо гатовы,
Ды як паслаць у бор сасновы?
Каваль не можа знайсці адказ.

## ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

(*На палянцы сядзяць сумныя Зайцы, Сініцы, Бусел, Гусі. Крот робіць рухі, быццам паўзе.*)

**Аўтар**.
Апусціліся галовы ніц
У зайцоў, у бусла і ў сініц.
І сядзяць, маўчаць у поўнай скрусе
Усе звяры і нават гусі.
Тут паўзе маленькі крот.
Увесь зямлёй забіты рот.
Пабудуе самалёт крот.
Яго завуць Фядот.
**Крот**.
Што тут за сум?
Вашу бяду
Лапай адной
Я развяду.
**Звяры**.
Ты паможаш нам, Фядот?
Пабудуеш самалёт?
Бо патрэбна нам, браток,
Перавезці малаток.
**Крот**.
Так. Я магу
Зрабіць самалёт.
Я тады буду
Галоўны пілот.
Бяры ў дзюбу,
Бусел, лапух,
І павязём малаток
Мы ўдвух.
Крыламі ты
Будзеш махаць.
Буду табой
Я кіраваць.
**Бусел**.
Дзякуй табе за наказ, —
Гэта раз.
Памагла твая галава, —
Гэта два.
Ну, а болей не гавары, —
Гэта тры.
Памагатых такіх зусім мне
Не трэба.
Калі ж хочаш
Пабачыць ты неба
І зайздросціш нам, буслам,
Паспрабуй узніміся сам!
**Аўтар**.
І, варухнуўшы крыламі,
Ляціць лугамі, лясамі.
Узяў лапух моцна ў дзюбу ён.
Нясе ў ім вузялочак.
Завязан там малаточак.
Ляціць, спяшаецца паштальён.

## ДЗЕЯ ЧАЦВЁРТАЯ

(*Дупло-хатка Вавёркі. Каля яе ўсе звяры. Яны стаяць парамі ці па некалькі разам. У цэнтры — Вавёрка з Буслом.*)

**Аўтар**.
А ў вавёрачак у хаце
Ужо здаровая маці.
Шмат шуму, радасці і сяброў.
Ім перадаў вестку дзяцел.
І, бусла каб сустракаці,
Ужо ўвесь лес у іх даўно гатоў.
**Вавёрка**.
Дзень добры. Што ў белым свеце чуваці:
На лузе, балоце і сенажаці?
**Бусел**.
Ах, якія ў нас навіны, —
Вы ж самі ведаць павінны,
Як прыйшла тэлеграма,
Што баліць раток у мамы,
Мы не спалі трэція суткі,
Не зналі шчаслівай мінуткі.
Я цяпер спакойны за ваш раток, —
Вось вам бранябойны малаток.
**Дочкі**.
Мы забылі даць тэлеграму,
Што ўжо добра ўсё ў мамы.
Не баліць яе раток.
Не патрэбны малаток.
**Вавёрка**.
Ну, перастаньце, паслухайце маці!
Нам малаточак спатрэбіцца ў хаце.
**Звяры**.
Тут доўга ішла ў іх гаворка.
Усе былі ў вавёркі,
І суму там не было зусім.
Было там шмат толькі смеху,
Толькі грыбоў і арэхаў.
І расказалі прыгоды ўсім
Пра Веру-вавёрачку
І пра яе горачка,
Пра яе маленькіх дочак,
Пра вавёрчын малаточак,
Пра птушынага пасла —
Даўганосага бусла,
Пра жыццё-быццё лясное
І яшчэ пра тое-сёе.

# ЗНАЁМСТВА З КАЗКАЙ (1 г)

На працягу заняткаў педагог можа выкарыстоўваць загадкі пра казкі, якія знойдзе ў "Кнізе для настаўніка" пад рэдакцыяй Т. М. Савельевай (Мн., "Народная асвета",

1987, с. 129 — 130). Пажадана прапанаваць вучням "праспяваць" пэўныя адказы на пытанні, падбіраючы любую мелодыю.

**Гульня "Пра якую казку я думаю?"**. Вядучы апісвае падзеі з пэўнай казкі, але не называе імёнаў. Дзеці адгадваюць, што гэта за казка. Хто адгадаў, становіцца вядучым. У канцы гульні педагог пераказвае падзеі з казкі В. Віткі "Вавёрчына гора".

**Расказ педагога** ці спецыяльна падрыхтаванага вучня пра В. Вітку і яго творы. Звяртаецца ўвага на тое, што В. Вітка разам з М. Шаўлоўскай з'яўляюцца аўтарамі падручніка "Роднае слова" для II класа. Гутарка пра творы пісьменніка, якія дзеці чыталі.

**Праслухоўванне казкі** ў выкананні кіраўніка ці спецыяльна падрыхтаваных удзельнікаў гуртка.

**Гутарка** па змесце казкі (увага звяртаецца на тое, што дзеянні адбываюцца ў казачным лесе).

Чым адрозніваецца казачны лес ад звычайнага?

З якімі жыхарамі лесу знаёміць нас В. Вітка?

Хто дапамагаў Вавёрцы? Чым?

Хто аказаў большую дапамогу?

Ці патрэбна была дапамога Вавёрцы, калі ўлічваць, што яна не паспела ў час? Чаму?

**Гульня "Хто жыхары гэтага дома?"**. На дошцы ці ў дзяцей на сталах — "хаткі" з назвамі: "Кемлівы", "Спагадлівы", "Рашучы", "Хуткі", "Удзячны". Дзеці "рассяляюць" герояў па "хатках". Магчыма, нехта з герояў трапіць на жыхарства адразу ў некалькі "хатак". У час наступнай гутаркі вучні адказваюць на пытанні:

Чаму вы пасялілі героя менавіта ў гэту "хатку"?

Якія рысы характару павінны быць у хлопчыка (дзяўчынкі), што будзе іграць пэўную ролю?

Якімі вы ўяўляеце сабе галоўную гераіню казкі, Дочак і Сына?

Як яны адносяцца да матулі?

Што б вы зрабілі ў падобнай сітуацыі? А каб жылі ў казачным лесе?

**Гульня "Знайдзі прыпынак"**. Адзін вучань чытае тэкст казкі. Дзеці, калі пачынаецца маналог героя, падымаюць чырвоную картку. На пачатку наступнага маналога — зялёную і г. д.

**Гульня "Прыдумай свой варыянт заканчэння казкі".** Удзельнікі гуртка групай (ці індывідуальна) прыдумваюць празаічны варыянт заканчэння казкі.

**Расказ выхавальніка пра прафесію ілюстратара**. Разгляданне варыянтаў афармлення казкі В. Віткі "Вавёрчына гора" рознымі мастакамі. Маляванне казачнага лесу і яго жыхароў. На гэтых занятках дзеці пачынаюць афармляць кніжку па казцы, малююць вокладку.

**В. Г. КУХАРОНАК,**
**аспірантка НІА.**
г. Мінск.

*(Заканчэнне будзе)*

# З ДАПАМОГАЙ ГУЛЬНІ

Групы прадоўжанага дня існуюць у школах амаль ужо чатыры дзесяцігоддзі, але цяжкасцей у працы выхавальнікаў гэтых груп яшчэ шмат. І не дзіўна, бо выхавальніку даводзіцца штодзённа выступаць у ролях настаўніка, клапатлівай матулі, умелага на ўсе рукі таты, спартыўнага трэнера, масавіка-забаўніка і г. д. Бясспрэчна і тое, што кожны рэжымны этап у групе прадоўжанага дня мае вялікае значэнне для выхавання і станаўлення дзіцяці як асобы.

Адным з самых важных этапаў у рэжыме дня любога школьніка, тым больш таго, хто наведвае групу прадоўжанага дня, з'яўляецца, на мой погляд, этап падрыхтоўкі ўрокаў. Задача выхавальніка не толькі ў тым, каб дзеці без памылак зрабілі пісьмовыя і добра вывучылі вусныя заданні. Куды больш важна навучыць іх працаваць самастойна, замацаваць і паглыбіць веды, атрыманыя на ўроках. Таму працэс самападрыхтоўкі павінен быць цікавым, творчым і ні ў якім выпадку непадобным на ўрок. Правядзенне самападрыхтоўкі ў форме ўрока перашкаджае фарміраванню ў школьнікаў самастойных і самаадукацыйных навыкаў. Дзеці прывыкаюць да пастаяннай дапамогі выхавальніка і пачынаюць нядбайна адносіцца да вучэбнай працы. Навошта думаць, калі можна спытаць "А як выканаць гэта заданне?" і атрымаць адказ.

Я, працуючы выхавальніцай у групе прадоўжанага дня, на этапе самападрыхтоўкі выкарыстоўваю методыку вучэбнай гульні, аб чым і хачу расказаць. У пачатку навучальнага года дзеці падзяляюцца на дзве (можна на тры ці чатыры) групы — каманды. Пажадана, каб у кожнай была аднолькавая колькасць хлопчыкаў і дзяўчынак, моцных і слабых у вучобе, вучняў розных класаў. Каманда выбірае назву, дэвіз і капітана. Апошняга можна час ад часу мяняць. Дэвіз (напрыклад, прымаўкі тыпу "Навука вочы адкрывае", "Ад навукі дужэюць рукі", выказванні выдатных педагогаў і інш.) афармляецца ў выглядзе плаката і вывешваецца ў класе. Мэта дэвіза — засяродзіць увагу вучняў на фарміраванні самаадукацыйных навыкаў, выхаванні працавітасці, мэтанакіраванасці.

Кожны вучань атрымлівае (або перапісвае) памятку, у якой тлумачыцца, як выконваць заданні па мове, матэматыцы, як вучыць на памяць вершы, працаваць над памылкамі, якія ўрокі рыхтаваць спачатку (вусныя ці пісьмовыя) і да т. п.

Перад пачаткам падрыхтоўкі дамашніх заданняў на дошцы запісваюцца назвы прадметаў і час, за які трэба выканаць заданне па іх. Капітаны правяраюць у членаў каманды наяўнасць неабходных падручнікаў, сшыткаў, дзённікаў і да т. п. Спачатку кожны дзень, а з цягам часу пры неабходнасці ўзгадваецца парадак выканання пэўнага задання.

Працэс самападрыхтоўкі будуецца ў выглядзе конкурсу з элементамі гульні "Што? Дзе? Калі?". Па ўмове конкурсу вучань, які самастойна выконвае дамашняе заданне, атрымлівае 5 балаў. Пытанне "Як гэта зрабіць?" з цягам часу можна пачуць вельмі рэдка. Нават на прапанову выхавальніка дапамагчы, растлумачыць пэўнае заданне ўсё часцей гучыць: "Спачатку я падумаю сам".

Вялікую ролю набывае ўзаемаправерка паміж членамі каманды. Дзеці стараюцца не дапускаць памылак у сябе і ўважліва правяраць работу сяброў, бо за кожную дапушчаную і нявыпраўленую памылку каманда губляе 10 балаў. Нязнойдзеныя памылкі могуць выправіць члены іншай каманды, і тады яны атрымліваюць 10 балаў. Зразумела, усе заданні выконваюцца спачатку ў чарнавіках.

Дадатковыя балы вучні могуць атрымаць за адказы на пытанні тыпу: з якой мэтай вы выконвалі практыкаванне? Чаму навучыліся? Якое правіла выкарыстоўвалі? Чаму рашалі задачу менавіта так? Ці можна рашыць яе іншым спосабам? І да т. п.

Методыка гульні пры праверцы вусных заданняў мае свае асаблівасці. Вось якія, напрыклад, заданні могуць выконваць каманды пры вывучэнні літаратурных твораў:

1. Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце план.
2. Знайдзіце ў тэксце апісанне таго, што вы бачыце на малюнку.
3. Чаму апавяданне называецца менавіта так?
4. Які загаловак далі б гэтаму апавяданню вы?
5. Знайдзіце самае доўгае слова.
6. Знайдзіце і зачытайце дыялог (маналог).
7. Выпішыце з тэксту назоўнікі (прыметнікі і да т. п.).

Калі героямі апавядання з'яўляюцца прадстаўнікі жывёльнага свету, можна прапанаваць дадатковыя заданні тыпу: назавіце пароды сабак, якія вы ведаеце. Як людзі прыручылі сабак? Ці ёсць у вас дома "жывы куток"? Якія вершы, песні, кнігі, фільмы вы ведаеце пра герояў апавядання? І г. д.

Пералік пытанняў і заданняў конкурсу можна прапанаваць дзецям загадзя. Тады школьнікі не толькі з цікавасцю будуць выконваць заданне, але і самастойна набудуць шмат карыснай інфармацыі і з задавальненнем падзеляцца ёю з аднакласнікамі.

Праверку вусных заданняў можна арганізаваць і па прынцыпу экзамену. Кожная каманда атрымлівае па 5 — 6 пытанняў, абмяркоўвае іх. Лепш, каб кожны член каманды меў магчымасць адказаць на пэўнае пытанне. У ходзе такой работы вучні ўзнаўляюць, замацоўваюць і набываюць пэўныя веды па вывучаемай тэме. Акрамя таго, яны вучацца выступаць перад публікай.

У якасці фізкультхвілінак можна выкарыстоўваць танцавальныя нумары, карагоды і г. д.

Увогуле, вучэбную гульню пажадана выкарыстоўваць на ўсіх этапах рэжыму групы прадоўжанага дня. Вядома, спачатку школьнікі будуць старацца "зарабіць" балы, але з цягам часу добра паводзіць сябе ў сталовай, дапамагаць таварышу, актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, выконваць заданні самастойна, цікавіцца дадатковай літаратурай па вывучаемай тэме стане ў дзяцей прывычкай.

**Т. І. ШКРЭДАВА,**
**выхавальніца ГПД СШ № 1.**
г. Мсціслаў.